УДК 947.6 (“1921–1939”)

# НАРОДНЫЯ РАМЁСТВЫ І ПРОМЫСЛЫ Ў ШТОДЗЁННАСЦІ ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА (1921–1939 гг.)

***В. П. Гарматны***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Інстытут парламентарызму
і прадпрымальніцтва

*У артыкуле паказана месца народных рамёстваў і промыслаў у штодзённым жыцці насельніцтва Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг., адзначаны іх асноўныя віды і асаблівасці, разгледжана заканадаўчая база і меры па дзяржаўнай падтрымцы саматужніцтва.*

**Ключавыя словы:** здабыча, рамяство, саматужнік, ткацтва, ганчарства.

## Уводзіны

Для задавальнення патрэб насельніцтва ў вопратцы, абутку і прадметах дамашняга абіходу, прыладах працы і інструментах жыхароў Заходняй Беларусі ў міжваенных польскіх улад не хапала магутнасцей фабрычна-завадской вытворчасці. Акрамя таго, справу ўскладняла недастаткова развітая транспартная сетка. У сувязі з гэтым з 1920-х гг. тут і асабліва на Палессі пачынаецца адраджэнне і бурнае развіццё раменнай вытворчасці і промыслаў, на якіх, дарэчы, практычна ніяк не адбіўся сусветны эканамічны крызіс 1929–1933 гг.

## Асноўная частка

Паводле меркаванняў сучаснікаў, “на Белай Русі, на Палессі і часткова на Валыні, перш за ўсё ў вёсках, размешчаных у аддаленасці ад гарадоў, селянін вырабляе ледзьве не ўсе тавары першай неабходнасці, а менавіта кухонныя прылады, лодкі, вопратку, бялізну, абутак, сані і вазы, сельскагаспадарчы і рамесніцкі інвентар, кашы, сеці і спажывецкія вырабы.

Чым далей ад чыгункі, тым большая і разнароднейшая назіраецца самазабяспечанасць народнага промыслу. Бадай, найбольш распаўсюджаны гэты промысел на Палессі, дзе з-за транспартных цяжкасцей селянін вымушаны вырабляць усё для сябе самастойна. Промыслы гэтыя неарганізаваныя. Прымітыўныя прылады дазваляюць вырабляць вельмі нязначную колькасць на задавальненне ўласных альбо суседскіх патрэб, рэдка лішнія вырабы вывозяцца на навакольныя рынкі і кірмашы, дзе некаторыя вырабы таксама скупляюцца пасярэднікамі”. Акрамя таго, вельмі часта нетаварны характар промыслаў вынікаў не толькі з недахопаў тавару, але і з псіхалагічных прычын (мабыць, незаўсёды прыязнае стаўленне да чужакоў і жаданне мець запас на “чорны дзень”): “Звычайна ўласных вырабаў не жадаюць прадаваць, тлумачачы тым, што маюць іх мала, хоць не адпавядае гэта рэчаіснасці” [1, s. 69–71].

Многія тагачасныя журналісты з вялікай доляй перабольшвання гаротнага стану жыхароў Палесся ў мэтах сенсацыйнасці адзначалі: “У дрэнных, худых хатах, дзе грош не кружыў па вёсцы, вяртаюцца да старых праўдаў самадастатковасці <...> Паляшук патрапіць абысціся нават без цвікоў, ужываючы драўляныя калочкі. Перапрацоўваючы ўласную сыравіну, выкарыстоўваючы вольны ад сельскагаспадарчых работ час, вёска павялічвае свой дабрабыт, працуючы на сябе. У выпадках, калі прадае свае вырабы, [вясковец] атрымлівае дадатковы заробак, які дазваляе яму выжыць на дрэнных і скупых [мясцовых] грунтах” [2, с. 187].

Пад рамёствамі разумеецца дробная вытворчасць, заснаваная на індывідуальнай ручной працы з выкарыстаннем механічных прылад і інструментаў. Пры гэтым кожны прыродны матэрыял, што служыць асновай для вырабу разнастайных рэчаў, патрабуе свайго “індывідуальнага падыходу”, асобай тэхнікі апрацоўкі, спецыфічных навыкаў і прылад працы [3, с. 106]. Польскія даследчыкі адносяць да рамеснікаў дробнатаварных вытворцаў, якія ажыццяўлялі сваю гаспадарчую дзейнасць на падставе карты рамесніка, а таксама ўсіх незалежных індывідуальных прадпрымальнікаў, маючых менш за пяць наёмных працаўнікоў [4, с. 73].

© Гарматны В. П., 2018

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Да пачатку XX ст. рамясло прайшло тры перыяды свайго развіцця: хатняе рамяство, рамяство на заказ, рамяство як дробнатаварная вытворчасць (саматужная прамысловасць). У міжваенны перыяд у заходнебеларускіх мястэчках былі прадстаўлены ўсе тры пералічаныя формы рамяства і для большасці насельніцтва рамяство было звязана выключна з рынкам. З тэрмінам “рамяство” вельмі цесна пераплятаецца тэрмін “промысел”, пад якім разумеецца рамяство, разнастайныя віды вырабаў, вызначаныя на продаж ці на заказ, занятак з мэтай здабычы дадатковых сродкаў існавання [3, с. 106; 5, с. 188; 6, с. 22–23].

Напачатку 1920-х гг. дзейнасць у напрамку падтрымкі і развіцця саматужных промыслаў на Палессі разгарнуў Камітэт дапамогі польскім Крэсам усходнім, які быў аддзелам амерыканскай арганізацыі анабаптыстаў (аднаго з накірункаў неапратэстантызму). У ваяводстве імі быў створаны аддзел саматужных промыслаў, які займаўся арганізацыяй ткацтва і вышыўкі. Палатно прадавалася на кірмашах, вышыўкі народных майстроў ішлі на экспарт, большай часткай у ЗША. На 1926 г. у ваяводстве пад патранатам Камітэта працавала 348 майстроў у 33 вёсках [7, с. 14].

Акрамя таго, у 1920–1930-я гг. Польшча была адзінай еўрапейскай дзяржавай, якая мела досыць распрацаваную заканадаўчую базу, накіраваную на рэгуляванне рамяства і рамеснай вытворчасці. Польскія ўлады былі зацікаўлены ў плённым развіцці гэтай культуры, і з гэтай мэтай Сеймам міжваеннай Польшчы 31 ліпеня 1924 г. прыняты Закон аб народных промыслах, на падставе якога гэтая галіна пачала атрымліваць істотныя ўрадавыя фінансавыя субсідыі. З 1918 г. у складзе Міністэрства прамысловасці і гандлю дзейнічаў аддзел народных промыслаў, з дапамогай якога ў 1920-я гг. былі створаны чатыры таварыствы дапамогі народным промыслам: у Вільні, Навагрудку, Брэсце (з 1925 г.) і Беластоку, якія наладжвалі выставы і кірмашы ў многіх мястэчках Заходняй Беларусі [8, с. 344]. Асноўным дакументам, які вызначаў прававое палажэнне раместваў у Польшчы і Заходняй Беларусі, было “Прамысловае права” ад 16 снежня 1927 г., выдадзенае на аснове распараджэння прэзідэнта Польшчы “Аб прамысловым праве” ад 7 чэрвеня 1927 г. Гэта першы нарматыўны акт, які рэгуляваў пытанні дзейнасці рамяства ў Польшчы пасля аднаўлення незалежнасці.

Згодна з артыкулам 144 прамысловага права: “Хто пачынае самастойнае правядзенне рамяства, павінен адначасова з заявай паказаць прамысловай уладзе і інстанцыі, што мае прафесійныя здольнасці для правядзення дадзенага рамяства”. Гэты артыкул у дапаўненне да распараджэння прэзідэнта Польшчы 1934 г атрымаў некаторыя змены: “Ажыццяўляць рамесную вытворчасць можна толькі пасля атрымання ад прамысловай улады і інстанцыі рамеснай карты, выдадзенай пасля доказу перад гэтай уладай валодання прафесійнымі здольнасцямі для правядзення дадзенага рамяства”. Атрыманне рамеснай карты было вельмі маруднай справай, якая патрабавала шмат часу для збору ўсіх неабходных дакументаў і вялікіх фінансавых выдаткаў. Каб атрымаць карту, неабходна было мець польскае грамадзянства, дыплом аб здачы экзамена па адпаведнай спецыяльнасці, а таксама аплаціць рамесную карту. Сама працэдура атрымання рамеснай карты была наступнай: рамеснік звяртаўся да павятовага старасты з прашэннем аб дазволе атрымаць карту і прадстаўляў усе неабходныя дакументы. Потым павятовы староста накіроўваў дакументы ў рамесную палату, якая на аснове прадстаўленых матэрыялаў вырашала пытанне аб выдачы рамеснай карты. Часцей за ўсё рамеснікі не маглі прадставіць неабходныя дакументы на вядзенне рамяства, таму вымушаны былі звяртацца з просьбамі да павятовых стараст. Так, напрыклад, жыхар Косіцкай гміны Брэсцкага павета Зыгмунт Катшыцкі ў 1934 г. звяртаўся з паданнем да палескага ваяводы. У ім сцвярджалася, што рамяством муляра ён займаўся ўжо даўно. Да першай сусветнай вайны працаваў у бацькі спачатку ў якасці вучня, а потым і чаляднiка. Аднак падчас вайны бацька загінуў і не пакінуў ніводнага дакумента, які мог бы пацвердзіць яго прафесійныя здольнасці ў дадзеным

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

рамястве. Таму ён звяртаўся да ваяводы з просьбай дазволіць яму вытрымаць неабходны іспыт пры рамеснай палаце. Да свайго прашэння ён прыклаў сведчанні інжынера І. Масталанскага і архітэктара В. Новака, у якіх яны пацвярджалі яго прафесійныя здольнасці. На аснове 146-га артыкула прамысловага права Брэсцкая рамесная палата вызваліла Катшыцкага ад неабходнасці іспытаў. Аднак такія выпадкі былі адзінкавыя. Вельмі часта рамеснікі звярталіся з прашэннямі вызваліць іх ад кваліфікацыйных іспытаў. Асноўнымі прычынамі называліся непісьменнасць і цяжкае матэрыяльнае становішча: не ўсе рамеснікі маглі заплаціць за экзамен пошліну памерам 40 злотых. Былі выпадкі, калі рамеснікам адмаўлялі ў выдачы рамеснай карты па прычыне іх маладога ўзросту: напрыклад, у рамеснай карце было адмоўлена краўцам Гершону Векслеру і Абраму Уладаўскаму, жыхарам Брэста, шаўцу Боруху Юлевічу, жыхару вёскі Лахва Лунінецкага павета [9, с. 79].

У снежні 1936 г. у мемарыяле, накіраваным у Раду Міністраў міжваеннай Польшчы, адзначалася наяўнасць на Палессі 38 400 асоб, якія працавалі ў сферы рамесніцтва і валодалі 12 800 адзінкамі інвентару (у сярэднім 1 прылада і 3 працаўнікі на 88 мясцовых жыхароў). У мемарыяле рабілася выснова пра нізкі працэнт насельніцтва, занятага ў рамесніцтве, і недастатковую іх тэхнічную ўзброенасць [10, s. 19], але з гэтым можна не пагадзіцца, улічваючы тое, што абсалютная большасць мясцовых сялян-саматужнікаў не рэгістравалася ў адпаведных органах і таму не трапляла ў статыстычныя звесткі, што прыводзіла аўтараў мемарыяла да такіх высноў.

Мястэчкі Заходняй Беларусі, і ў тым ліку Палесся, выступалі цэнтрамі сельскіх гмін і паступова мясцовыя рамеснікі манапалізавалі тут рамесную вытворчасць. Назіралася спецыялізацыя асобных рэгіёнаў ваяводства па вытворчасці вызначанай прадукцыі. Напрыклад, у вёсцы Гарадная Столінскага павета да рэвалюцыі 1917 г. ганчарным промыслам займаліся толькі тры сям'і, а ў міжваенны перыяд ён стаў на вёсцы паўсюдным (219 сямей), за выключэннем яўрэяў (каля 20% мясцовага насельніцтва). Белую гліну (каалін) здабывалі ў залежах на захад ад мястэчка. Кожны ганчар меў прымітыўную прыладу працы, так званы "станок". Працэс вытворчасці ганчарных вырабаў складаўся з некалькіх этапаў: падрыхтоўка гліны, выраб прадукцыі, сушка і апальванне посуду, а таксама яго аздабленне [1, с. 347]. У 1930-я гг. белагліняная кераміка ў Гарадной паступова выцясняецца глазураванай [11, с. 317].

У Гарадной існавала нават асобная сістэма мер ганчарнага посуду: увесь посуд падзяляўся на "дзясяткі" і "фуры" (вазы). Паасобку ён меў свае назвы: аб'ёмам каля літра называўся "мамзель", 2-літровы – "паўзлівач", 3-літровы – "злівач" ці "семак", ад 4 да 6 літраў – "нярознак", 6-8 літраў – "пададзінец", 8-16 – "адзінец" і звыш 16 літраў – "паляк". Аснову ўмоўнага дзясятка складалі 10 "мамзеляў". "Паўзлівачоў" ці "семакоў" прыходзілася 7 на дзясятак, "злівачоў" – 5, "нярознакаў" – 3, "пададзінцоў" – 2, "адзінцоў" – 3 на 2 дзясяткі, "палякоў" – 1 на дзясятак. Фурай лічылі 100 умоўных дзясяткаў посуду [12, с. 155]. Зробленыя гаршкі ганчар ладаваў на высокія фурманкі і ехаў ад вёскі да вёскі, дамоў жа вёз фурманку са збожжам, а часам па ацэнках даследчыкаў прыбытак памерам некалькі дзясяткаў злотых [2, с. 186]. У выніку Гарадная пераўтварылася ў мястэчка, цэнтр ганчарства ў радыусе 100 кіламетраў, а ў тутэйшых майстроў былі свае пастаянныя гандлёвыя месцы ў Львове, Варшаве, Беластоку і Любліне. Пра значнасць ганчарнага промыслу сведчыў той факт, што дзяўчаты з Гарадной адмаўляліся выходзіць замуж за хлопцаў, якія не ўмелі працаваць на ганчарным крузе. У сувязі з гэтым варта падкрэсліць, што вырабы сялян з вёскі Гарадной набылі агульнадзяржаўную вядомасць, і ў 1936 г польскімі дакументалістамі студыі "Авангард" была знята дакументальная кінастужка "Гарадная – мястэчка гліняных гаршкоў" (на жаль, не захавалася) [13, с. 282–283].

Няўдалай была спроба наладзіць у Гарадной выраб кафлі, што магло палепшыць матэрыяльны стан мясцовых жыхароў. Навакольная гліна апынулася непрыдатнай для вырабу кафлі. Майстры выраблялі ў сярэднім 100-150 штук кафлі, што было нязначным,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

каб наладзіць працэс вытворчасці [8, с. 347].

Яшчэ адным шырокараспаўсюджаным заняткам стала ткацтва, якое існавала ў форме хатняга промыслу. Большую частку яго прадукцыі складалі льняныя тканіны, якімі сяляне шырока карысталіся ў штодзённым быце. На Палессі для пашыву вопраткі і бялізны з-за дарагоўлі прывазнога матэрыялу амаль усё вясковае насельніцтва выкарыстоўвала тканіны ўласнага вырабу. Па ацэнках даследчыкаў сярэдні рабочы год у ткацкім промысле складаў 100 дзён (каля 90 дзён зімой і 14 летам). За гэты перыяд ткачыха выпрацоўвала ад 20 да 50 метраў гатовай ільняной тканіны шырынёй не больш за 70 см. Кошт палатна вагаўся ў залежнасці ад рэгіёна і ў сярэднім складаў 1 злоты 50 грошаў [7, с. 14].

У 1920-я гг. у гарадах міжваеннай Польшчы назіраўся рост вытворчасці дэкаратыўных тканін, якія былі важным складнікам убрання жылога памяшкання, аднак, улічваючы іх дарагоўлю, акцэнт усё ж робіцца на танныя вясковыя тканіны. У 1935–1936 гг. попыт на дадзены від тканіны паступова пачынае зніжацца ў сувязі з шырокім развіццём фабрычнай вытворчасці па перапрацоўцы льна. Найбольш распаўсюджанымі вырабамі ткацкага промыслу былі ручнікі, палатно для вопраткі, абрусы, пакрывалы, коўдры. Сярод цэнтраў ткацтва па вытворчасці сукна на 1927 г. можна назваць Олтуш Брэсцкага павета (1 423 м), Бездзеж (1 144 м), Адрыжын (1 000) і Хомск (977) Драгічынскага павета, Пескі (600) Косаўскага павета, За-гародна (1 523) Пінскага павета, Гарадзечна Пружанскага павета (1 045) і г. д. [14, s. 198–199].

Давыд-Гарадок спецыялізаваўся на пашыве скураной вопраткі і вырабе вялікагрузных лодак, а хутка на аснове рамеснага цэха ўзнікла суднаверф, на якой з 1932 г. выраблялiся рачныя баржы (спыніла існаванне ў 1960-я гг). Боты з Давыд-Гарадка былі вельмі арыгінальнымі, бо галоўка бота не прышывалася да халявы, а выцягвалася, таму карысталіся вялікім попытам у войску і сярод паляўнічых. Той факт, што прэзідэнт міжваеннай Польшчы Ігнацы Масціцкі спецыяльна прыязджаў сюды для таго, каб заказаць паляўнічыя боты, красамоўна гаворыць сам за сябе [15, с. 59]. На Другім "Палескім кірмашы" (22 жніўня – 5 верасня 1937 г.) Давыд-Гарадоцкі шавецкі кааператыў прадставіў воданепранікальныя паляўнічыя чаравікі і нават спартовы абутак [16, с. 373].

У Лунінецкім павеце шырокае распаўсюджванне атрымаў сплаўны промысел, дрэва адсюль сплаўлялі аж да Балтыкі і Чорнага мора. Былі развіты таксама дапаможныя промыслы, у першую чаргу здабыча смалы, выраб дзёгцю (сродак для догляду за скураным абуткам, а таксама змазка для гужавога транспарта). У наваколлі (перш за ўсё Століншчына і Піншчына) развівалася бандарства (выраб бочак, кадак і г. д.).

Мястэчка Моталь Драгічынскага павета стала цэнтрам вырабу знакамітых кажухоў, якія карысталіся вялікім попытам. Першапачаткова кажухі былі доўгімі, шчыльнымі да стану, з адкладным каўняром, белымі і нядубленымі, а з 1930-х гг. кажухі сталі вырабляць з дубленых аўчын, якім надавалі чырвона-цагляны альбо вохрысты колер [17, с. 543]. Дзякуючы шырокай распаўсюджанасці авечкагадоўлі тут выраблялася таксама шмат скураной вопраткі, і, такім чынам, промыслы істотна ўплывалі на эканамічныя і сацыяльныя змены ў наваколлі.

У выніку развіццё рамёстваў і промыслаў вяло да пашырэння ў рэгіёне фінансава-крэдытнай сістэмы: узнікае шмат ашчадных кас, у статуце якіх утрымліваўся параграф, што дазваляў крэдытаванне рамеснай вытворчасці (Савет грамадзянскай апекі ў Брэсце). Такім чынам, рамесная вытворчасць і промыслы набываюць новыя арганізацыйныя формы і юрыдычнае забеспячэнне, што яскрава сведчыць пра штучнасць уяўлення пра Палессе як цывілізацыйна адсталы і ізаляваны рэгіён [15, с. 60].

## Заключэнне

Народныя рамёствы і промыслы адыгрывалі важную ролю ў штодзённым жыцці насельніцтва Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг.: давалі яму магчымасць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ва ўмовах дарагоўлі прамысловых тавараў, якія былі не заўсёды ў наяўнасці, забяспечыць сябе самым неабходным. Акрамя таго, адначасова з'яўляліся для палешукоў важнай крыніцай дадатковага прыбытку, а для многіх з іх нават і першаснай.

Найбольш распаўсюджанымі промысламі на Палессі былі промыслы, звязаныя з перапрацоўкай мясцовай сыравіны: перш за ўсё з апрацоўкай дрэва, металу, скуры, вырабам мэблі, адзення, абутку, посуду.

Неабходна адзначыць, што статыстычныя дадзеныя, якія адлюстроўваюць колькасць рамеснікаў і рамесных майстэрань на Палессі ў міжваенны перыяд і колькасць выробленай імі прадукцыі, з'яўляюцца ў многім недакладнымі з-за таго, што некаторыя мясцовыя майстры з мэтай пазбегнуць дадатковых падаткаў дзейнічалі без афармлення рамесных карт альбо займаліся некалькімі промы-сламі, у той час як карту атрымлівалі толькі на адзін з іх.

### СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. ***Tomaszewski, J.*** Z dziejów Polesia, 1921–1939: zarys stosunków społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. – Warszawa : Państ. Wydaw. Nauk., 1963. – 208 s.
2. ***Церабунь, Г.*** Архіўныя крыніцы і друкаваныя выданні па гісторыі Палесся міжваеннага перыяду ў зборах Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці / Г. Церабунь // Загароддзе-3 : мат. навук.-краязнаўч. канф. "Палессе ў ХХ стагоддзі", 1–4 чэрвеня 2000 г., Беласток. – Мінск : Тэхналогія, 2001. – С. 179–188.
3. ***Цітоў, В. С.*** Этнаграфічная спадчына: Беларусь. Традыц.-бытавая культура / В. С. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 2001. – 205 с.
4. ***Кабот, Т. Ф.*** Развитие ремесленного производства в Полесском воеводстве в межвоенный период (1921–1939 гг.) / Т. Ф. Кабот // Осень 1939 года: коренной перелом в судьбе белорусского народа : материалы регионал. науч.-практ. конф., посвященной 70-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР, 24–25 сентября 2009 года / [редакторы: Н. Н. Ковалева, Л. Ю. Малыхина]. – Брест : БрГТУ, 2009. – С. 72–78.
5. ***Вайцешчык, Г. С.*** Рамесніцкія заняткі местачкоўцаў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / Г. С. Вайцешчык // Працэсы ўрбанізацыі ў Беларусі: ХіХ – пачатак ХХі ст.: зб. навук. арт. – Гродна : ГрДУ, 2010. – С. 186–195.
6. ***Катюшкина, А. А.*** Развитие ремесла на территории Западной Беларуси (1921–1939 гг.) / А. А. Катюшкина // Сборник научных статей студентов, магистрантов, аспирантов / БГУ, Факультет международных отношений. – Минск, 2014. – Вып. 12. – С. 22–24.
7. ***Кабот, Т. Ф.*** Кустарные промыслы на Полесье в межвоенный период / Т. Ф. Кабот // Вестник Брестского государственного технического университета. – 2009. – № 6. – С. 13–16.
8. ***Вайцешчык, Г С.*** Мястэчка Гарадная – "запаведнік ганчарства" на Палессі ў 1921–1939 гг. / Г. С. Вайцешчык // Культура, наука, образование в современном мире : материалы V Междунар. научн. конф. / редкол.: Л. Л. Мельникова [и др.]. – Гродно : ГГАУ, 2011. – С. 344–348.
9. ***Лаўрэенка, Л. В.*** Развіццё рамяства і рамеснай вытворчасці на заход-небеларускіх землях у 1921–1939 гадах / Л. В. Лаўрэнка // Вестник Полоцкого государственного университета. – 2013. – № 1. – С. 77–82.
10. Gospodarcze i kulturalne potrzeby województwa poleskiego : według memoriału wręczonego w dniu 17 Xii 1936 roku Prezesowi Rady Ministrów. – Warszawa : Towarzystwo Rozwoju Rady Ministrów, 1937. – 25 s.
11. Общественный, семейный быт и духовная культура населения Полесья / Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора АН БССР, Ин-т искусствоведения, фольклора и этнографии им. М. Ф. Рыльского АН УССР (Львов. отд-ние). – Минск : Наука и техника, 1987. – 374 с.
12. ***Молчан, С. Ю.*** Стан захавання ганчарнага рамяства вёскі Гарадная / С. Ю. Молчан // Гісторыка-культурная спадчына Брэсцка-Пінскага Палесся: паміж мінулым і будучыняй (да 450-годдзя г. Століна) : зб. мат. Міжнар. навук. канф., 28–29 верасня 2005 г. : у 2 частках. Ч. 1. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2006. – С. 153–157.
13. ***Лабачэўская, В. А.*** Ганчарнае рамяство і промысел вёскі Гарадная Столінскага раёна Брэсцкай вобласці: праблема захавання і развіцця / В. А. Лабачэўская // Фальклярыстычныя даследаванні: кантэкст, тыпалогія, сувязі : зб. навук. арт. Вып. 11. – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – С. 282–284.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

14. ***Лавреенко, Л. В.*** Ремесла и промыслы жителей Белорусского Западного Полесья в 20–30-е годы XX в. / Л. В. Лавреенко // Polesie-Rodopy. Zeszyty Cyrylo-metodianskie. – 2016. – № 5. – S. 196-202.
15. ***Никитенков, И.*** Народные ремесла в экономике Полесского воеводства (1920–1939 годы) / И. Никитенков // Беларусь і Польшча ў ХХ стагоддзі: агульнае і адметнае ў гістарычных лёсах : мат. міжнар. студ. навук.-практ. канф., Брэст, 7–8 крас. 2000 г., рэдкал.: І. І. Акінчыц [і інш.]. – Брэст : БрДУ, 2001. – С. 58–60.
16. ***Лаўрэнка, Л. В.*** Гандаль на тэрыторы Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / Л. В. Лаўрэнка // Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі : зб. навук. арт. – Мінск : Бел. навука, 2016. – С. 367–374.
17. Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Іванаўскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 590 с.

Паступіў у рэдакцыю 10.05.2018 г.
Кантакты: vitharmatny@mail.ru
(Гарматны Віталь Пятровіч)

**Harmatny V. FOLK CRAFTS AND TRADES IN EVERYDAY LIFE OF POLESIE VOIVODESHIP (1921–1939).**

*The article shows the place of folk crafts in the daily life of the population of the Polesie Voivodeship in 1921–1939, their main types and features are noted, the legislative base and measures for state support of handicrafts are considered.*

**Keywords:** craft, trade, handicraft, weaving, pottery.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова